У мэтах папулярызацыі беларускай мовы *19 студзеня 2023 г.* у 1 «А» класе была праведзена гульня «Размаўляй па-беларуску». Вучні ў ходзе гульні пазнаёміліся з беларускімі зімовымі гульнямі, а таксама вывучылі новыя словы беларускай мовы па тэме “Зіма”. Вучні складалі сказы з новымі словамі, суаднесілі словы з малюнкамі і перакладам слоў. У ходзе мерапрыемсва дзеці зрабілі сняжкі з паперы, а пасля падзяліліся на 2 каманды і гулялі ў сняжкі. Чаргаванне гульнявой і маўленчай дзейнасці спыяе лепшаму засваенню новых ведаў. Вывучэнне роднай мовы праз гульню развівае творчыя здольнасці, прывівае любоў да мовы і Радзімы.




У канцы гульні кожны вучань атрымаў закладкі для кніг з беларускімі словамі і цікавымі надпісамі.




